УДК 882.6–3

*Г.В. НАВАСЕЛЬЦАВА*

# МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ МІНУЛАГА Ў ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА І УЛАДЗІСЛАВА ВАНЧУРЫ

*У артыкуле даследуецца выяўленне ў прозу Уладзіміра Караткевіча такой з'явы "філасофіі гісторыі", як "міжчасавы правал", што прадстаўлены матывам нацыянальна-вызваленчага паўстання. Прадыктаваны рэалістычнай эстэтыкай аўтара гістарычны*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*час вылучаецца мастацкай падзейнасцю і толькі дапаўняецца эпічным зместам. Абумоўленая рамантычным светабачаннем Уладзіміра Караткевіча катэгорыя міфалагічнага часу прадстаўляе анталагічна-універсальнае бачанне беларускага мінулага. Гістарычна-эпічнаму і анталагічнаму часу беларускага аўтара тыпалагічна блізкі мастацкі час чэшскага пісьменніка Уладзіслава Ванчуры. У творы апошняга "Малюнкі з гісторыі народа чэшскага" мінулае асэнсоўваецца ў ідэйна-мастацкім гістарычным і эпічным часе, які спалучаецца з народнапаэтычнай міфалагічнай вобразнасцю.*

## Уводзіны

Агульнавядома, што гістарычныя падзеі, міфалагічныя і фальклорныя ўяўленні маюць вялікае значэнне на розных этапах развіцця літаратуры. Не будзе перабольшваннем сказаць, што генезіс гістарычнай прозы пачынаецца з гісторыі і міфалогіі, якія выступаюць галоўнымі крыніцамі творчай фантазіі аўтараў. Уладзімір Караткевіч, якога называюць беларускім Вальтэрам Скотам, распачаў у айчыннай літаратуры жанр гістарычнай прозы. Раманы пісьменніка "Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі", аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха" выразна ілюструюць тыповы для творчай манеры аўтара сінтэз гістарычнай факталагічнасці і мастацкай умоўнасці. Як зазначана ў шэрагу даследчыцкіх прац [1; 2; 3], творы Уладзіміра Караткевіча характарызуюць яго індывідуальны стыль як адметнае спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага пісьма.

Праблема ўзаемадзеяння гістарычнай дакладнасці і мастацкай свабоды аўтара ў літаратурным творы знаходзіцца ў цэнтры ўвагі караткевічазнаўства. Комплекснае вывучэнне творчасці пісьменніка пачалося з прац Анатоля Вераб'я, які даследуе індывідуальны стыль: "Уладзіміру Караткевічу характэрна рамантычнае, фальклорна-міфалагічнае і адначасова канкрэтна гістарычнае, па-мастацку дакладнае і дасканалае асэнсаванне мінуўшчыны" [1, с. 76]. На спалучэнні канкрэтна гістарычнага і рамантычнага акцэнтуе ўвагу і Аркадзь Русецкі, падкрэсліваючы гераічны прынцып рамантычнай эстэтыкі Уладзіміра Караткевіча. Так, побач з рэалістычным падыходам да адлюстравання роднай гісторыі пастаўлена свядомая гераізацыя жыцця і змагання беларусаў, стварэнне рамантычных вобразаў народных заступнікаў, якія ў складаных сацыяльных абставінах разумеюць неабходнасць барацьбы з прыгнятальнікамі і праяўляюць у ёй мужнасць, гераізм, высокую самаахвярнасць [2]. Разам з тым даследчыкамі не закранаецца паняцце мінулага часу як паказальнай у сэнсавым і стылёвым плане мастацкай катэгорыі, якая ў гістарычным – звернутым да мінулага – кантэксце выступае выключна важным вобразным сродкам.

## Асноўная частка

Навукоўцы звяртаюцца да вывучэння сімволікі і міфатворчасці ў караткевічаўскай гістарычнай прозе. Вольга Шынкарэнка адзначае ўмелае выкарыстанне пісьменнікам міфалагічных і легендарных вобразаў, якія часта вырастаюць да памераў сімвалаў, надзеленых эмацыянальнасцю і філасофскай глыбінёй. Даследчыца заўважае, што "многія з сімвалаў ствараюць непасрэднае адчуванне гістарычнага быцця народа, дапамагаюць асэнсаваць ідэйную скіраванасць твора" [3, с. 138-139]. Гістарычная факталагічнасць галоўнага рамана Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" не паказана ў строгай сюжэтнай храналогіі. Галіна Ішчанка падкрэслівае "логіка-асацыятыўнае вядзенне аповяду, што дазволіла пісьменніку ўвасобіць свет аб'ёмна, у адзінстве знешніх прыкмет і ўнутранай логікі падзей у гістарычных маштабах быцця і паглыблена-псіхалагічных перажываннях асобы" [4, с. 94]. Сказанае дазваляе зрабіць выснову, што ў творчасці Уладзіміра Караткевіча выяўляецца не толькі гістарычны час. У прыватнасці, аўтарскае ўвасабленне мінулага дазваляе вылучыць **міфалагічны, гіста-**

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**рычны, эпічны час**. Так, "міфалагічныя канцэпты часу набліжаюцца да тэорыі адноснасці з паняццем часу-прасторы (у міфалагічнай прасторы час цячэ запаволена ці наогул не існуе)" [5, с. 550]. Найбольйш глабальнай часавай парадыгмай міфа выступае цыклічнасць: бясконцы паўтор першапачаткова зададзеных вялікіх і малых цыклаў. Гістарычнаму часу ўласціва лінейнасць, што дазваляе выявіць "цэласнасць такіх сацыяльна-культурных з'яў, як нацыянальнасці, краіны, гарады, сацыяльныя групы, прафесіі" [6, с. 189]. Гістарычны час лагічна дапаўняецца выразна скіраваным у старажытнасць часам эпічным, што вызначаецца як "абсалютнае мінулае", час прабацькоў і герояў, выразна адмежаваны ад рэальнай сучаснасці [7].

Міхаіл Бахцін, гаворачы пра першыя еўрапейскія гістарычныя раманы, сярод якіх "Артамэн, або Вялікі Кір" Скюдзеры, "Арміні і Туснельда" Лоэнштэйна, звяртае ўвагу на своеасаблівую "філасофію гісторыі", "якая прадстаўляе рашэнне гістарычных лёсаў таму міжчасаваму правалу, што ўтвараецца паміж двума момантамі рэальнага часавага раду" [7, с. 133]. У "міжчасавым правале" вырашаюцца пытанні маральна-этычнага зместу: праблемы чалавечых памылак, ваганняў, выбару. Падобнае прысутнічае і ў паэтыцы гістарычнага рамана Вальтэра Скота: "Закулісныя дзеянні таямнічых дабрадзеяў і злодзеяў, своеасаблівая роля выпадку, рознага роду прадказанні і прадчуванні" [7, с. 133]. Уладзімір Караткевіч таксама выкарыстоўвае прыём "міжчасавага правалу", што дазваляе пісьменніку, як і Вальтэру Скоту, стварыць у сваіх раманах мастацкае ўвасабленне гістарычных эпох XVI – XIX стст.

У сувязі з вышэйсказаным *мэта* нашага даследавання наступная: выявіць мастацкую характарыстыку гістарычнага "міжчасавага правалу" ў прозе Уладзіміра Караткевіча.

Адной з галоўных *задач*, прадугледжаных пастаўленай мэтай, з'яўляецца даследаванне сэнсавазнакавых і стылеўтваральных сродкаў асэнсавання "міжчасавага правалу" ў прозе Уладзіміра Караткевіча праз кантэкстуальнае тыпалагічнае параўнанне апошняй з прозай чэшскага пісьменніка Уладзіслава Ванчуры.

Мастацкі час Уладзіміра Караткевіча развіваецца паралельна з гістарычным часам біяграфій герояў і разам з тым выпадае з рэальнага часу. У караткевічаўскага папярэдніка Вацлава Ластоўскага прадстаўлены сінкрэтызм міфалагічнага і гістарычнага часу на прыкладзе эпічнага вобраза гераічнай краіны волатаў Крывіі. Міфапаэтычныя элементы, скіраваныя на стварэнне эпічнасці, прысутнічаюць і ў індывідуальным стылі Уладзіміра Караткевіча. У рамане "Каласы пад сярпом тваім" знаходзім: "Яны чорныя, як косць, гэтыя мораныя дубы. Як абгарэлая чорная косць. І калі бачыш на водмелі напаўзанесенае пяском мокрае бервяно – адразу становіцца зразумела, адкуль узяў народ паданне аб волатах, што спяць, засыпаныя жвірам і заплеценыя травой, спяць, пакуль не прыйдзе час вялікай бяды і пакуль іх не пакліча народ" [8, с. 12]. Разам з тым мастацкі час ва Уладзіміра Караткевіча вызначаецца якасна іншымі характарыстыкамі, чым у Вацлава Ластоўскага. Пачынальнік гістарычнай прозы на аснове гістарычнай факталагічнасці стварае адметную мастацкую падзейнасць, што і дазваляе вызначыць час аўтара як гістарычны. Так, у "Каласах пад сярпом тваім" пісьменнік ахоплівае эпоху напярэдадні паўстання 1863 – 1864 гг. У гістарычным часе мастацкая падзейнасць атрымлівае лінейную аўтарскую інтэрпрэтацыю, што якасна адрозніваецца ад цыклічнасці міфалагічнага часу і толькі дапаўняецца "абсалютна мінулым" эпічным часам. Тыпалагічна блізкая беларускаму пісьменніку гістарычная рэцэпцыя мінулага заяўлена таксама і ў спадчыне чэшскага пісьменніка Уладзіслава Ванчуры.

Ідэя галоўнага рамана Уладзіміра Караткевіча знаходзіць поўнамаштабнае сімвалічнае ўвасабленне ў вобразе асобы з сярпом. Пісьменнік гаворыць пра

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

ушанаванне і памяць чалавекам сваіх продкаў, праз якую здабываецца еднасць з роднай зямлёй і народам. У гэтым выявілася традыцыйнасць караткевічаўскай рэцэпцыі беларускага мінулага, якая ўзыходзіць да міфалагічнай і сімволіка-алегарычнай спадчыны Яна Баршчэўскага першай паловы XIX ст. Разам з тым сімвалічна ўвасобленае бажаство з сярпом рэпрэзентуецца і ў гістарычным часе. Васьмісотгадовая гісторыя Загорскіх, якія зберагаюць і перадаюць з пакалення ў пакаленне памятныя кнігі, дакументы, карціны, зброю, складаецца з “сарака доўгіх чалавечых жыццяў”, што пакінулі свой след у родавай хроніцы. Жыццё на зямлі, па якой раскіданы магілы, капцы і курганы, патрабуе вялікай мужнасці і гераізму, пра што кажа Юры Загорскі: “І кожнаму наступнаму цяжэй, бо ён нясе большы цяжар” [8, с. 75]. Гэта не толькі боль і крыўда слабага, але і адказнасць за свае ўчынкі, якая перадаецца ў спадчыну нашчадкам. Пачынальнік роду полацкі дружыннік Глеб з вялікай жорсткасцю прыводзіў сваіх суайчыннікаў да новай хрысціянскай веры і пад канец, не вытрымаўшы адказнасці за бязвінна пралітую кроў, скончыў сваё жыццё ў манастве. Усім яго нашчадкам Загорскім, якія “з імператарамі не ладзілі, караля не паважалі, калі ён быў не варты таго” [8, с. 157], засталася ў спадчыну згубленая таямніца пра бажаство з сярпом. Вынікам страты мудрасці, а значыць, і духоўнасці, сталася тое, што нашчадкі асуджаны на няведанне, якое аплачваецца паднявольным становішчам краю. Язычніцкі серп у выглядзе маладзіка, увасабленне якога прачытваецца надзвычай шырока, у лёсавызначальныя гістарычныя моманты жне каласы, што сімвалізуюць людзей Прыдняпроўя. Падобным чынам зашыфраваныя ў назве рамана міфапаэтычныя вобразныя сродкі ствараюць міфалагічны часавы план, якім задаецца ідэйна-мастацкі змест твора. Перыяды актыўнасці асобы з сярпом прыпадаюць на нацыянальна-вызваленчыя паўстанні, што маркіруюцца пісьменнікам як “міжчасавыя правалы”.

Чэшскім пісьменнікам Уладзіславам Ванчурам створаны тыпалагічна блізкія вобразам князёў Загорскіх Уладзіміра Караткевіча вобразы каралёў у цыкле навел “Тры каралі з роду Пршэмыславічаў” з твора “Малюнкі з гісторыі народа чэшскага”, які мае падзагаловак “Праўдзівае апавяданне пра жыццё, справы ратныя і духа ўзвышэнне”. Твор вызначаецца “паэтычным успрыманнем узноўленых гістарычных эпох” [9, с. 158] і спалучае традыцыйны для чэшскай літаратуры жанр гістарычнай хронікі з драматычным дзеяннем навелы. Перыяды “міжчасавых правалаў”, увасобленыя Уладзіславам Ванчурам праз ваенныя матывы, адлюстроўваюцца згодна з падзейнай хронікай каралеўскага кіравання. Спыняючыся на першым цыкле навел, трэба назваць пачынальніка каралеўскага роду Пршэмысла Атакара, які “забывае сваё знатнае паходжанне, проста зносіцца з гандлярамі, не баіцца запэцкаць пальцаў, нібы ён сам фарбавальшчык або валюшнік, болей шукае выгоды і прыбыткаў, чым славы” [10, с. 17-18] і таму атрымлівае каралеўскую карону. Вынікам яго вайсковых дзеянняў сталі негатыўныя сацыяльныя з’явы, апісаныя ў навеле “Голад і бунт”. Чарговы “міжчасавы правал”, які звязаны з нашэсцем сумна вядомага ўсёй Еўропе хана Батыя, прыпадае на перыяд кіравання наступніка Пршэмысла Вацлава. Узвялічваў сваю краіну Пршэмысл Атакар II, рамантызаваны вобраз якога прадстаўлены ў навеле “Бітва”. Вобраз караля выяўляе героіка-патрыятычныя каштоўнасныя прыярытэты Уладзіслава Ванчуры: “Заспявалі чэшскія воіны. Кароль Пршэмысл – сама хуткасць, сама пільнасць, сама воля і думка – вызначае месца пражскаму бургграфу пану Ярашу і пану Воку з Розенберга, земскаму маршалу і пану Борэшу. За імі ён сам вядзе свой полк” [10, с. 220]. Аднак у апошнія гады кіравання неабачлівыя каралеўскія ўчынкі прывялі да паражэння ў бітве на Мараўскім полі, пасля чаго для цэлай краіны настаў перыяд ліхалецця,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

прадстаўлены ў аднайменнай навеле. Кароль Пршэмысл сваімі лёсавызначальнымі для нашчадкаў учынкамі нагадвае караткевічаўскага дружынніка Глеба. Перыяд "міжчасавага правалу", як рэпрэзентуе яго чэшскі аўтар, характарызуецца знішчальнымі для нацыі крывавымі міжусобіцамі і таму атрымлівае негатыўную аўтарскую ацэнку. Тыпалагічна блізка выяўляе адмоўныя фактары для нацыянальнага станаўлення беларускі творца, які негатыўна ацэньвае шматлікія страты ў нацыянальна-вызваленчых паўстаннях. Уладзіслаў Ванчура выбірае апавядальнікам звычайнага чалавека рыцарскага звання, які ўдзельнічаў у మараўскай бітве і таму імкнецца адпомсціць здраднікам. Гістарычныя страты, прадстаўленыя праз светабачанне не надзеленага ўладай героя, асэнсоўваюцца і праз міфатворчую народнапаэтычную вобразнасць цудаў і сноў, якія ў сваю чаргу заяўляюць пра мастацкі міфалагічны час.

Беларускім аўтарам выключна асэнсоўваецца "міжчасавы правал" паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Вобраз самога Каліноўскага, з якім сябруе і з якім духоўна блізкі галоўны герой "Каласоў...", станоўча характарызуецца ў рамане. Думаецца, суджана стаць паплечнікам Кастуся Алесю Загорскаму, які выратоўвае вечнага паўстанца Чорнага Войну. Невыпадкова героі рамана ведаюць такіх славутых паўстанцаў мінулага, як Васіль Вашчыла, Міхась Крычаўскі, Мурашка. Уладзімір Караткевіч звязвае з матывам паўстання нацыянальнае абуджэнне, што заяўлена ўжо ў раннім творы пісьменніка – легендзе "Маці Ветру" (пазней драма "Маці ўрагану"). Паказальна ў ідэйна-мастацкім плане асэнсоўваецца легендарнае паўстанне караля Стаха Горскага (аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха"). Міфапаэтычныя вобразы легенды ілюструюць міфалагічны час, з дапамогай якога раскрываецца ідэйна-мастацкі змест гістарычных падзей. Вартая ўвагі і таямніца чатырохсотгадовай даўнасці, звязаная з Валюжынічам і іншымі паўстанцамі ў рамане "Чорны замак Альшанскі". Думаецца, што гэты твор асабліва выразна паказвае лёсавырашальную для нашчадкаў спадчыннасць гісторыі: даўні прыхаваны скарб прадвызначае трагедыю ў Альшанах як у Вялікую Айчынную вайну, так і пэўныя негатыўныя людскія ўчынкі ў часы галоўнага героя Косміча.

Далейшы лёс краю ў асобах яго лепшых патрыётаў-паўстанцаў 1863 – 1864 гг. паказаны пісьменнікам у апавяданні "Сіняя-сіняя", пралогу рамана "Нельга забыць" "Паром на бурнай рацэ", драме "Кастусь Каліноўскі". Да караткевічаўскіх гераічных кіраўнікоў паўстанняў можна аднесці Рамана Ракутовіча – барвянага ўладара з аповесці "Сівая легенда", Юрася Братчыка з рамана "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", а таксама Гервасія Выліваху з аповесці "Ладдзя роспачы". Тып героя-патрыёта Уладзіміра Караткевіча, які ў любых жыццёвых абставінах застаецца верным высокім маральным ідэалам, захоўвае чалавечы гонар і годнасць, нагадвае лагічнае развіццё вобраза шляхціца Далівы (апавяданне "Люцынка, альбо Шведы на Літве") Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Творчая манера Уладзіслава Ванчуры прыкметна адрозніваецца ад манеры Уладзіміра Караткевіча тым, што чэшскі пісьменнік увасабляе не толькі перыяды "міжчасавага правалу", але і эпохі росквіту. Багатая на станоўчыя нацыянальныя здабыткі эпоха Пршэмысла Атакара І, якая ў аўтарскай інтэрпрэтацыі вызначаецца не толькі жыццёапісаннем каралёў, але і звычайных людзей. Пры гэтым Уладзіслаў Ванчура дапаўняе гістарычны час вобразнай народнай міфапаэтыкай. Напрыклад, у навеле "Спявак" акаляючая рэчаіснасць прадстаўлена праз яе анімізацыю, якая ў сваю чаргу раскрывае мастацкі міфалагічны час твора. У выніку эпохі росквіту чаргуюцца з "міжчасавымі правaламі", што ілюструе цыклічны (міфалагічная цыклічнасць раскрываецца з пазіцый канкрэтна гістарычнай перыядызацыі) змест чэшскай гісторыі ў асэнсаванні Уладзіслава Ванчуры.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

## Заключэнне

Як вядома, Уладзімір Караткевіч быў адным з тых пісьменнікаў, што востра адчувалі неабходнасць ідэйна-тэматычнага і жанрава-стылёвага абнаўлення беларускай літаратуры. Пісьменнік асэнсоўвае беларускую гісторыю як з'яву "міжчасавага правалу", выхад з якога ён бачыць праз вырашэнне актуальных нацыянальна-вызваленчых пытанняў. Апошнія можа вырашыць толькі паўстанне, якое ўвасабляецца з дапамогай міфапаэтычных вобразных сродкаў, што ў сваю чаргу выяўляюць міфалагічны часавы план. У раманах "Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі", аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" гістарычны час вызначаецца сімвалічнай заглыбленасцю ў міфалагічнае мінулае, якое надае анталагічную універсальнасць мастацкім гістарычным падзеям і фактам. У гэтым бачыцца працяг традыцыі Яна Баршчэўскага, які асэнсоўваў мінулае ў сімваліка-алегарычнай форме. Гістарычны час у творах Уладзіміра Караткевіча з'яўляецца сэнсава самадастатковым, паўнавартасным мастацкім часам, які толькі дапаўняецца катэгорыяй эпічнага часу і які вызначаецца філасофскім ідэйна-мастацкім зместам.

Праводзячы аналогіі з чэшскай літаратурай, у якой працэс станаўлення гістарычнай прозы ў многім супадаў з беларускай, трэба сказаць, што мастацкі час у творах Уладзіміра Караткевіча і Уладзіслава Ванчуры ("Малюнкі з гісторыі народа чэшскага") тыпалагічна блізкія. Чэшскі пісьменнік у адпаведнасці з жанрам гістарычнай хронікі рэпрэзентуе на факталагічнай аснове мастацкі гістарычны час, які складаецца з перыядаў "міжчасавых правалаў" і эпох росквіту. Увасоблены праз ваенны матыў "міжчасавы правал" характарызуецца як гістарычна-эпічная катэгорыя, блізкая прадстаўленаму матывам паўстання "міжчасаваму правалу" беларускага пісьменніка. Уладзіслаў Ванчура не звяртаецца да ідэйна-знакавых вобразаў, але стварае блізкую беларускаму аўтару анталагічна-універсальную рэцэпцыю мінулага. Пры гэтым мастацкая ўмоўнасць чэшскага пісьменніка прадстаўлена народнай міфапаэтыкай, што выяўляе падпарадкаванне мастацкага міфалагічнага часу ідэйным мэтам гістарычнага. Гэтай ідэйнай перавагай гістарычнага часу чэшская проза істотна розніцца з прозай Уладзіміра Караткевіча, сэнсавая і стылёвая міфалагічная крэатыўнасць якога стварае адметную мастацкую падзейнасць, што не дакладна рэпрэзентуе гістарычную факталагічнасць, а пашырае, удакладняе, канкрэтызуе яе з дапамогай мастацкай умоўнасці. Такім чынам, прадстаўленае беларускім пісьменнікам увасабленне мінулага, гарманічна спалучаючы асноўныя стылеўтваральныя прыёмы аўтараў XIX – пачатку XX стст., раскрывае падзейную сітуацыю "міжчасавага правалу" ў гістарычна-эпічным і анталагічна-універсальным міфалагічным часе. Уладзіслаў Ванчура асэнсоўвае "міжчасавыя правалы" і гістарычныя эпохі росквіту ў ідэйна-мастацкім гістарычным і эпічным часе, якому падпарадкоўваюцца народнапаэтычная цудадзейнасць і міфалагічная анімізацыя.


*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Верабей, А.*** Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А. Верабей. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 271 с.
2. ***Русецкі, А.*** Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ. творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 300 с.
3. ***Шынкарэнка, В.*** Пад ветразем дабра і прыгажосці: Жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча / В. Шынкарэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 175 с.
4. ***Ішчанка, Г.*** Каласы адродзяцца ў зерні / Г. Ішчанка. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2002. – 109 с.
5. ***Вуглік, І.*** Час у міфе / І. Вуглік // Беларуская міфалогія: энц. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 550-551.
6. ***Бахтин, М.*** Эстетика словесного творчества / М. Бахтин. – Москва: Искусство, 1979. – 424 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

7. ***Бахтин, М.*** Литературно-критические статьи / М. Бахтин. – Москва: Худож. лит., 1986. – 543 с.
8. ***Караткевіч, У.*** Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; рэдкал. С. А. Андраюк [і інш.]. – Мінск: Маст. літ., 1989. – Т. 4. – 399 с.
9. ***Филипчикова, Р.*** Творчество Владислава Ванчуры: Искусство синтеза и контрапункта / Р. Филипчикова; Ин-т мировой лит. им. А.М. Горького РАН. – Москва: ИМЛИ, 1999. – 191 с.
10. ***Ванчура, В.*** Картины из истории народа чешского: в 2 т. / В. Ванчура; пер. с чеш. – Москва: Худож. лит., 1991. – Т. 2. – 413 с.

Паступіў у рэдакцыю 06.07.2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова